Быць прыладай у руках Бога

Аўтар: Кінга Красіцкая
28.06.2020 00:00



Мы не часта сустракаем на сваім шляху людзей з вялікім сэрцам, адданасцю і пакорай. Павінна вельмі пашанцаваць, каб паглядзець такой асобе ў вочы, каб, сустрэўшыся з ёю, спазнаць аўтэнтычнасць гэтых цнотаў і каштоўнасцей.

Многія вернікі з парафіі Найсвяцейшага Адкупіцеля ў Гродне асабіста знаёмы з а. Юзафам Гензам CSsR – чалавекам самаадданага служэння, выпраменьваючым радасць, адкрытым для іншых. Святар прываблівае пачуццём супакою, разважнасці, мудрасці. Шл ях да святарства

Паважаны юбіляр паходзіць з Тарноўскай дыяцэзіі (Польшча). Нарадзіўся недалёка ад Тухава, дзе знаходзяцца марыйны санктуарый і духоўная семінарыя айцоў рэдэмптарыстаў.

Хлопец выхоўваўся ў шматдзетнай сям'і. Акрамя яго, бацькі гадавалі яшчэ трох сыноў і пяць дачок. Маці пераважна займалася домам і гаспадаркай, а бацька быў пекарам. †

–

Каб трапіць у касцёл, трэба было пераадолець 3 кіламетры, але нас гэты кавалак дарогі не палохаў, – успамінае а. Юзаф. – Цэлай грамадой, разам з дзецьмі з суседніх дамоў мы ішлі на св. Імшу, на Ружанец, рараты. Я прыслужваў міністрантам. Часам гэта былі даволі складаныя часы як для мяне, так і для маіх бацькоў і пробашча, таму што парой я мог нарабіць клопату.



Калі юнак скончыў школу, здаў экзамены і быў прыняты ў ліцэй, маці спытала яго, ці не

хацеў бы вучыцца ў айцоў рэдэмптарыстаў. Бацька ж, хоць і быў веруючым і набожным чалавекам, меў крыху іншае меркаванне.

– Паколькі я старэйшы сын у сям'і, тата бачыў маё жыццё інакш, – расказвае а. Юзаф. – ***Ён думаў, што я першым скончу навучанне, атрымаю прафесію і буду карысным для нашай вялікай сям'і. Але сталася так: я забраў дакументы з ліцэя і накіраваўся да айцоў рэдэмптарыстаў, дзе 4 гады вучыўся ў іх мужчынскай гімназіі з перспектывай у будучыні паступіць у семінарыю.***

Пасля некалькіх гадоў навучання юнак сапраўды паступіў у навіцыят. Праз год яго прызвалі ў армію, дзе служыў танкістам. Гэта быў час сутычкі паміж касцёлам і камуністычнымі ўладамі, таму пасля набору, калі салдатам прызначаліся асобныя функцыі ў падраздзяленні, камандзір палка спытаў навіцыянта, ці збіраецца ён пасля вярнуцца ў семінарыю. Пачуўшы станоўчы адказ, малады чалавек быў накіраваны ў роту лінейных.

– Потым, між іншым, у мяне цікавіліся, асабліва пад канец службы, ці не хацеў бы вучыцца ў Акадэміі бранятанкавых войскаў у Познані. Але я падзякаваў і вярнуўся ў семінарыю.

А ўжо ў 1970 годзе быў пасвечаны, – адзначае а. Юзаф. – ***Памятаю, што ў той дзень было вельмі сонечна і перад св. Імшой я хадзіў па алеях побач з семінарыяй і паўтараў словы падзякі біскупу, якія меўся сказаць на заканчэнне ўрачыстасці. Асабліва ўзгадваю просьбу маліцца за нас, новапрэзбітэраў, бо "гэты скарб мы носім у гліняных посудах", якія могуць разбіцца.***

Яму трэба ўзрастаць, а мне станавіцца меншым (Ян 3, 30)

Гэтыя словы былі змешчаны на прыміцыйным абразку а. Юзафа, які на працягу ўсіх гадоў свайго служэння стараўся справіцца з пастаўленай мэтай. Адразу пасля семінарыі ён быў накіраваны ў Торунь, дзе займаўся катэхізацыяй моладзі. Потым вывучаў каталіцкую тэалогію ў Варшаве, а таксама праводзіў катэхезы для вучняў выпускных класаў і апекаваўся душпастырствам студэнтаў.

Вярнуўшыся ў Тухаў, займаўся манаскай моладдзю спачатку як прэфект пастулата, а потым як настаўнік (магістр) навіцыята.

– У семінарыі маёй задачай было, перш за ўсё, вядзенне лекцый, – успамінае юбіляр. ***– Шчыра кажучы, не меў вялікай ахвоты да гэтага, нават згадаў аб тым падчас размовы з правінцыялам. Аднойчы ўвечары ён пастукаўся ў мой пакой і спытаў, ці не хацеў бы паехаць у Беларусь. Я адказаў, што калі маю што там рабіць, чаму б і не? Таму быў накіраваны ў Гродна. Нясу тут паслугу ўжо 23 гады.***

Быць прыладай у руках Бога

Аўтар: Кінга Красіцкая
28.06.2020 00:00

